# Заява ўдзельнікаў Першага з’езда беларусаў Чэхіі

Мы, удзельнікі Першага з’езда беларусаў Чэхіі, выказваем салідарнасць з мужным народам Украіны, які змагаецца супраць агрэсіі пуцінскай Расіі. Мы дапамагалі і будзем надалей дапамагаць народу Украіны, украінскім і беларускім уцекачам у Чэхіі, а таксама тым беларусам, якія абараняюць Украіну ад захопнікаў.

Сучаснае становішча ў Беларусі не можа не турбаваць ніводнага сумленнага чалавека. Рэжым абвясціў вайну ўласнаму народу. Амаль 1400 прызнаных палітычных вязняў, больш за 50000 рэпрэсаваных пасля жорсткага і гвалтоўнага падаўлення ў 2020 годзе народнага паўстання беларусаў.

Беларусь усё больш уцягваецца ў згубную павуціну так званага “русского мира”. Гэта стала магчымым у выніку шматгадовай здрадніцкай палітыкі рэжыму Лукашэнкі. Сёння расійскія агрэсары практычна акупавалі Беларусь, выкарыстоўваюць нашу зямлю і інфраструктуру дзеля агрэсіі супраць суседняй Украіны. Расія падтрымлівае рэжым, які абсалютна ігнаруе нежаданне беларускага народа быць уцягнутым у вайну, накіраваную на знішчэнне ўкраінскай дзяржаўнасці і генацыд украінскага народа.

Мы разумеем, што толькі ад саміх беларусаў залежыць, ці будзе Беларусь вольнай. На жаль, у сучасных умовах тэрору і рэпрэсій магчымасці актыўнага супраціву ўнутры Беларусі вельмі абмежаваныя. Аднак мы перакананы, што нашы агульныя высілкі здольны карэнным чынам змяніць сітуацыю ў нашай краіне.

Мы звяртаемся да Рады БНР, Аб’яднанага пераходнага кабінета, да ўсіх арганізацый беларусаў замежжа, да нашых добраахвотнікаў ва Украіне з заклікам распачаць больш эфектыўны і практычны дыялог дзеля кансалідацыі дзеянняў, накіраваных на перамогу над агрэсарам ва Украіне і ў Беларусі. Мы верым, што перамога Украіны стане працягам і завяршэннем беларускай мірнай рэвалюцыі і скончыць ганебную эру праўлення Лукашэнкі.

Мы ўдзячны чэшскаму грамадству, прэзідэнту, парламенту і ўраду Чэшскай Рэспублікі за падтрымку беларусаў у барацьбе за свабоду і незалежнасць Бацькаўшчыны, за захаванне сваёй нацыянальнай ідэнтычнасці. Мы разумеем, што пры сучасным становішчы гэтая падтрымка рэальна магчымая пакуль толькі па-за межамі Беларусі. Яна таксама патрэбна і беларусам у Чэхіі, якія былі гвалтам выціснуты з сваёй роднай зямлі, патрэбна суполкам, якія дапамагаюць захоўваць беларускую культурную спадчыну, падтрымліваюць палітвязняў, нашых добраахвотнікаў ва Украіне, гераічны ўкраінскі народ.

Мы заклікаем дзяржаўныя ўстановы ў дачыненні да беларусаў выконваць усе палажэнні міжнародных прававых актаў.

Мы звяртаемся да парламента Чэшскай Рэспублікі з запытам аб прызнанні Расійскай Федэрацыі тэрарыстычнай дзяржавай, а таксама аб прызнанні акупацыі Беларусі Расійскай Федэрацыяй.

Мы верым у перамогу над расійскім агрэсарам ва Украіне і ў Беларусі, над антыбеларускім рэжымам Лукашэнкі. Зробім усё ад нас магчымае, каб гэтая перамога прыйшла як найхутчэй. Верым, што большасць з нас марыць аб вяртанні на Бацькаўшчыну, якой спатрэбяцца дзясяткі тысяч адукаваных, кваліфікаваных, нацыянальна арыентаваных беларусаў. Верым, што вольная, незалежная, дэмакратычная Беларусь вернецца у сям’ю еўрапейскіх народаў.

Разам мы пераможам!

Жыве Беларусь! Слава Україні! Pravda vítězí!